

Згодна з ранейшым Жыллёвым кодэксам неплацельшчыкаў за камунальныя паслугі не маглі за гэта выселіць з прыватызаванай кватэры. Па новым можна. А як гэта будзе выглядаць?

СТАР. 3



Тэарэтычна ўсё выглядае як быццам бы гладка. А ў жыцці... нярэдка абарочваецца сапраўднай драмай. Ну хоць бы таму, што закрыццё школы — пачатак згасання вёскі.

СТАР. 3



Інтэрнэт-карыстальнікі вызначылі топ-10 паспяховых беларусак. Гэты рэйтынг — проста нагода даведацца, на каго ў нас жадаюць раўняцца і чый прыклад натхняе.

СТАР. 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 КРАСАВІКА 2013 г. СУБОТА № 69 (27434) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# МАКСІМАЛЬНА ЗНІЗІЦЬ УРОН АД ПАВОДКІ

**Пасяўную кампанію сёлета трэба праводзіць не проста ў аптымальныя тэрміны, а давядзецца рабіць гэта імгненна, паколькі з-за ўмоў надвор'я значна скараціліся агратэхнічныя тэрміны веснавых палявых работ, заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на нарадзе аб мерах па мінімізацыі наступстваў веснавой паводкі і гатоўнасці да правядзення веснавых палявых работ, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Звяртаючыся да ўдзельнікаў нарады, Прэзідэнт звярнуў асаблівую ўвагу на вельмі сціслыя тэрміны правядзення веснавых палявых работ у гэтым годзе. «Прычыны вы ведаеце: агратэхнічныя тэрміны па часе адыходзяць. Часу, каб правесці сяўбу яравых культур, а таксама і атрымаць у гэтым годзе добры ўраджай, застаецца вельмі мала, ён адыходзіць». Таму ў цяперашніх умовах пытанні падрыхтоўкі і правядзення веснавых палявых работ патрабуюць асаблівай увагі.

«Вясна спазняецца, зрушвае тэрміны пасяўной кампаніі. Вялікая колькасць снегу павысіць вільготнасць глебы, што таксама затрымае пачатак сяўбы. Ускладняе сітуацыю тое, што давядзецца практычна сумясціць апрацоўку азімых культур і яравую сяўбу. Таму трэба прадугледзець больш высокія тэмпы ўсіх работ, каб не ўпусціць аптымальныя тэрміны і закласці добрую аснову для новага ўраджаю», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, аграрыям давядзецца ў поўным сэнсе слова дзяжурыць на палях. «Як толькі поле гатова да сяўбы, яго трэба імгненна засеяць і чакаць, калі паспее глеба на іншым полі, дзе трэба будзе сабраць усю тэхніку ў кулак і імгненна засеяць. Як кажуць, кідай зерне ў гразь — будзеш князь», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка закрануў тэму добраўпарадкавання і навядзення парадку ў краіне. «Пытанне аб тым, як абудзіць наша грамадства ад зімовай спячкі, але перш за ўсё нам усім трэба прачнуцца і прывесці ў парадак нашу краіну, пачынаючы з дарог, дзе ўжо можна працаваць (дзе-нідзе гэтыя работы пачаліся ўжо, але вельмі павольна) і заканчваючы падворкамі ў сялян. Я губернатараў папярэджваў, што ў гэтым годзе вырашэнню гэтай задачы будзе ўдзелена асаблівая ўвага з боку Прэзідэнта», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

У краіне неабходна прыняць эфектыўныя меры, каб максімальна знізіць урон ад паводкі ў выпадку яе ўзнікнення, і абавязкова спрацаваць на папярэджанне.

«У нас катастрафічных пагроз не прадбачыцца, хаця ўзровень вясенняй паводкі прагназуецца больш высокі, чым звычайна, — сказаў Прэзідэнт. — Я не думаю, што пры такім раставанні снегу ў нас будзе абвал. Але ўсё ж супакойвацца нельга, таму што снег, які застаўся, гэта не снег — гэта лёд, а з гэтага лёду вады будзе нямала. Гэта не пушысты снег, як мы прывыклі звычайнай вясной, гэта ледзяны, напоўнены вадой снег, таму нам трэба працаваць на апярэджанне. Прыняць эфектыўныя меры, каб максімальна знізіць урон ад паводкі, калі яна ўзнікне. Ні ў якім разе не дапусціць страты людзей».

Згодна з прагнозамі, максімальныя ўзроўні вясенняй паводкі ў Беларусі ў гэтым годзе будуць вышэйшымі за сярэднешматгадовыя значэнні. Паводка будзе праходзіць у два перыяды. У час першага, які адбываецца цяпер, узровень вады будзе павышацца з-за раставання снегу ў Беларусі і ва Украіне. У другі перыяд прыток вады будзе ў рэкі, якія бяруць свой пачатак на тэрыторыі Расіі.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што вельмі важна яшчэ раз нагадаць людзям, што не МНС павінна адпампоўваць ваду з іх падворкаў, а гаспадарам дамоў самім трэба ўзяць лапаты і зрабіць адводы са двара, загадзя дастаць са склепа агародніну. У сваю чаргу дзяржава павінна дапамагчы адзінокім людзям, інвалідам, тым, хто не можа зрабіць гэтага самастойна з-за хваробы або ўзросту.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад мясцовых органаў улады, МНС і іншых экстранных службаў рэальна ацаніць існуючую сітуацыю і прыняць прэвентыўныя меры. У прыватнасці, арганізацыям Белкаапсаюза трэба забяспечыць дадатковы завоз у населеныя пункты, якія падтапляюцца, тавараў першай неабходнасці.

# СКАРОЦЯЦЬ ЧВЭРЦЬ ДЗЯРЖСЛУЖАЧЫХ

**Аптымізацыя сістэмы дзяржаўных органаў Беларусі павінна быць у асноўным завершана да 1 ліпеня гэтага года. Гэта прадугледжана ўказам №168 «Аб некаторых мерах па аптымізацыі сістэмы дзяржаўных органаў і іншых дзяржаўных арганізацый, а таксама колькасці іх работнікаў», які кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 11 красавіка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Гэтым нарматыўным актам прадугледжваецца скарачэнне колькасці работнікаў дзяржаўных органаў і арганізацый у сярэднім на 25 працэнтаў.

Указам зацвярджаецца новая тыпавая структура мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, парадак устанаўлення колькасці работнікаў апаратаў канцэрнаў, дзяржаўных устаноў, якія непасрэдна падпарадкаваны рэспубліканскім органам дзяржкіравання, бюджэтных арганізацый, якія фінансуюцца з бюджэтаў абласнога, базавага і пярвічнага ўзроўняў, раённых і сельскіх выканаўчых камітэтаў.

У прыватнасці, колькасць гарадскіх (гарадоў абласнога падпарадкавання), раённых выканаўчых камітэтаў і мясцовых адміністрацый раёнаў у гарадах, гарадскіх (гарадоў раённага падпарадкавання), сельскіх, пасялковых выканаўчых камітэтаў устанаўліваецца абласнымі, Мінскім гарадскім выканаўчымі камітэтамі ў межах колькасці работнікаў, замацаванай ва ўказе.

СТАР. 2





# ВЯЛІКАЯ ВАДА

**Ваду ў Петрыкаўскім раёне чакалі. Большую ці меншую, імгненную ці павольную, але да яе рыхтаваліся. Яе прадбачылі. Дарожныя службы і меліяратары, выратавальныя службы МНС і служба выратавання на вадзе, медыцынскія і сацыяльныя работнікі. І тым больш самі жыхары бліжэйшых вёсак запрыпяцкай зоны і набярэжных вуліц райцэнтра. Таму да прышэсця гэтай штогадовай вясновай госці тут ставяцца ўзважана, адсочваючы сітуацыю, пільна назіраючы за ростам узроўню вады ці, наадварот, за яго зніжэннем. Учора раніцай петрыкаўскі гідролаг-назіральнік Сяргей Багай зафіксаваў рост вады на сем сантыметраў. Узровень у матухне-Прыпяці дасягнуў 836 сантыметраў і перавысіў небяспечны ўзровень на 56 сантыметраў.**






Зонай асаблівай увагі ў гэтыя дні для работнікаў Петрыкаўскага аддзела па надзвычайных сітуацыях з'яўляецца тэрыторыя вёскі Снядзін і бліжэйшых да яе вёсак — Белін і Таргашын. Пра гэта паведаміў нашай газеце намеснік начальніка аддзела маёр унутранай службы Раман Палюкоў. Адрэзанымі вадою засталіся вёскі Валаўск і Маісеевічы. Туды двойчы на дзень ходзіць маторная лодка, перавозіць людзей. Пакуль не працуе паром і вадою заліты дарогі, экіпажу станцыі выратавання (ёю кіруе Андрэй Галіцкі) давядзецца дастаўляць людзей такім вось чынам. А гэты шлях складае добрых пяць кіламетраў.

У самім Петрыкаве вада адрэзала вуліцы ў набярэжнай зоне амаль цалкам. Падтоплены падворкі і агароды. Але гаспадары напагатове і на той выпадак, калі раптам вада стане вышэй і з'явіцца ў дамах. На вуліцы Прыпяцкай, якая вядзе да парома, жыхары пабудавалі кладкі і масткі, перасялілі вышэй жывёлу, прыгналі пад ганкі лодкі. І ўсё ж петрыкаўцы спадзяюцца, што паўтору паводак, якія былі на Прыпяці ў 1979 і 1999 гадах, сёлета не будзе. Спадзяюцца на літасць прыроды і, вядома, на саміх сябе. Нездарма кажуць: на Бога спадзявайся, але і сам не спі.

**На фотаздымках** жыхары Петрыкава і вялікая вада на ўскраіне гэтага райцэнтра.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей ЖАРДЗЕЦКІ, генеральны дырэктар УП «Мінаблгаз»:**

***«У Мінскай вобласці да 2016 года будзе газіфікавана прыродным газам каля 70% жылога фонду. У 2010-м у сталічнай вобласці было газіфікавана 55% жылога фонду, сёння гэты паказчык складае 61% — прыродны газ праведзены больш як у 624 тысячы кватэр. У гэтым годзе плануецца правесці прыродны газ у Свір Мядзельскага раёна, Дудзічы і Бялькові Пухавіцкага раёна, Селішча, Ляхаўшчыну, Масловічы Мінскага раёна. У 2014 годзе будуць газіфікаваны Далгінава Вілейскага раёна, Беліца, Рахманькі, Слабада, Клімавічы Мінскага раёна. У 2015-м — Крывічы і Будслаў Мядзельскага раёна, Падгор'е, Лускова, Пашковічы, Дулічы, Брадок Мінскага раёна. На Міншчыне па стане на 1 студзеня 2013-га газіфікавана амаль 35 працэнтаў сельскіх населеных пунктаў, у іншых абласцях рэспублікі — у межах 7-15. Усяго ж у цэнтральным рэгіёне краіны прыродным газам карыстаюцца жыхары 786 населеных пунктаў.»***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.04.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8630,00 | ▲ |
| Еўра | 11280,00 | ■ |
| Рас. руб. | 279,00 | ■ |
| Укр. грыўня | 1060,78 | ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +14° |
| Віцебск | + 11° |
| Гомель | + 9° |
| Гродна | + 12° |
| Магілёў | + 6° |
| Мінск | + 9° |

# СТАЛІЧНАЯ АРЭНДА ПРАЦЯГВАЕ ДАРАЖЭЦЬ

**Некалькі месяцаў таму наша рэдакцыя ўжо паведамляла, што ў Мінску назіраецца сур'ёзны дэфіцыт здымнага жылля па катэгорыі бюджэтных недарагіх кватэр. Што сёння назіраецца ў гэтай сферы жыллёвых паслуг, карэспандэнту «Звязды» расказала намеснік генеральнага дырэктара Цэнтра гандлю нерухомасцю «ПАКАДАН» Аксана ЛУКАШЭВІЧ.**

## БЮДЖЭТНЫХ КВАТЭР ПРАКТЫЧНА НЯМА

Паводле інфармацыі Аксаны Дзмітрыеўны, сітуацыя ў гэтай сферы паслуг галоўнага мегаполіса краіны нават пагоршылася.

Зараз у гэтае буйнейшае агенцтва нерухомасці сталіцы ў дзень трапляе каля 10—15 здымных кватэр з боку кватэраздатчыкаў. Яшчэ прыкладна год таму колькасць такой прапановы дасягала каля 50—60 варыянтаў арэнднага жылля. Больш за тое, у базу даных агенцтва зараз трапляюць галоўным чынам не бюджэтныя, а менавіта дарагія кватэры, цэннік якіх складае ад 500 долараў і вышэй. А вось заказы з боку патэнцыяльных кватарантаў звычайна акрэсліваюць максімальны цэннік па аднапакаёвых кватэрах у межах да 300—350 долараў, а па двухпакаёўках — да 400 долараў. Таму цяпер назіраецца рэзкае несупадзенне інтарэсаў (цэннікаў) тых, хто здае жыллё, і тых, хто яго плануе здымаць.

## МАКСІМАЛЬНЫ ЦЭННІК АДНАПАКАЁВАК — 350 USD

Бюджэтных аднапакаёвых кватэр на рынку арэнды Мінска сёння практычна няма. Праз агенцтвы часам магчыма адшукаць невялікія кватэры коштам 340—350 долараў, але і па такім кошце ўсім кліентам жылля ўжо не хапае. Сярэдні кошт стандартных аднапакаёвых кватэр складае ўжо 350—400 долараў. Адразу заўважу, што далёка не ўсе аднапакаёвыя здымныя кватэры ў Мінску зараз здаюцца па такім цэнніку. Тыя гаспадары, што здаюць свае кватэры ўжо даволі працяглы час, кошты за арэнду павялічваюць у разумных межах або ўвогуле не чапаюць. Кватэры без адпаведнага рамонту і з мэбляй савецкіх часоў і зараз здаюцца «старым» кватарантам па мінімальным цэнніку ў межах 220—250 долараў. І гэта справядліва, бо падобныя кватэры ў старых дамах больш і не каштуюць, аднак...

Цяпер часам гаспадары і такіх «слабенькіх» кватэр, на хвалі жорсткага дэфіцыту, пачалі карэктаваць цэннікі арэнды ў бок павелічэння.

Добрым попытам у кліентаў карыстаюцца і ліквідныя двухпакаёвыя кватэры. Так адбылося, што цяпер нават пустая двухпакаёвая кватэра каштуе ў ідэале для новых кватарантаў не менш як 370—400 долараў. Аднак і такой прапановы ў агенцтвах катастрафічна не хапае. А ўвогуле сярэдні кошт прапановы двухпакаёвых кватэр зараз знаходзіцца ў межах 450—480 долараў плюс кватплата.

Асобна адзначу, што адна- і двухпакаёвыя кватэры коштам больш за 500 долараў павінны мець нейкую разыначку, каб на такое жыллё адшукаўся кліент. Такія кватэры маюць еўрарамонт, дарагую мэблю ці сапраўды сучасны дызайн.

У базе агенцтваў практычна не засталося бюджэтных трохпакаёвых кватэр. Сярэдні кошт такога жылля складае каля 500 долараў. Часам магчыма адшукаць у новабудоўлях і таннейшыя трохпакаёўкі, але гэта хутчэй будзе выключэннем з існуючай прапановы.

Сёлета ў сталіцы пачынае назірацца яшчэ адна тэндэнцыя, калі непасрэдна побач з метро кватэры любых катэгорый прапануюцца кліентам не танней, чым за 450—500 долараў.

## ЛЕТАМ ЖЫЛЛЁ МОЖА КРЫХУ ПАТАННЕЦЬ, АЛЕ...

Цяпер на форумах у сацыяльных сетках некаторыя патэнцыяльныя кватаранты прапануюць сваім калегам не спяшацца здымаць дарагое жыллё, а пачакаць адкрыцця дачнага сезона. На іх погляд, хутка на рынак трапіць шмат таннага жылля «ад бабуль», якія звычайна летам жывуць на дачах, а кватэры здаюць у арэнду.

СТАР. 2

# НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ — ДА + 20

У суботу амаль паўсюдна пройдуць дажджы, паведаміла рэдакцыі **спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.** Удзень у асобных раёнах дажджы моцныя, а месцамі прагназуюцца першыя веснавыя навальніцы. Тэмпература ў ноч на суботу плюс 4—10, удзень — 8—14, а па ўсходзе нават да плюс 15—17.

І ў нядзелю ўначы, пераважна па ўсходзе, чакаюцца дажджы; удзень у асобных раёнах караткачасовыя ападкі. Тэмпература ў ноч на нядзелю 1—7 цяпла, удзень — плюс 7—13, месцамі — да 15.

У пачатку наступнага тыдня чакаецца сонечнае, без ападкаў, надвор'е. Тэмпература ў ноч на панядзелак 1—6 цяпла, удзень — плюс 11—17 градусаў. Захаваецца сонечнае і цёплае надвор'е і ў аўторак, удзень будзе на 1—3 градусы яшчэ цяплей.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## КІПРУ РЭКАМЕНДАВАНА ПРАДАВАЦЬ ЗАЛАТЫ ЗАПАС

Еўракамісія рэкамендавала Кіпру прадаць большую частку свайго залатога запасу для вызвалення грашовых сродкаў у памеры 400 мільёнаў еўра. Па цяперашніх цэнах выспе давядзецца рэалізаваць каля 10,36 тоны з агульнага рэзерву ў 13,9 тоны. Калі золата будзе рэалізавана, гэта будзе найбуйнейшы аднаразовы продаж каштоўнага металу ў свеце за чатыры гады. У 2009 годзе ЦБ Францыі вывеў на рынак 17,4 тоны золата. Продаж золата Кіпрам можа стаць адным з умоў прадастаўлення выспе дапамогі з боку Еўрасаюза. Усяго краіне спатрэбіцца 23 мільярды еўра, большую частку з якіх Нікасія павінна адшукаць сама.

## У ІЗРАІЛІ ЗНОЙДЗЕНА КАНСТРУКЦЫЯ ЎЗРОСТАМ КАЛЯ 4 ТЫСЯЧ ГАДОЎ



Легендарнае возера Кінерэт у Ізраілі, у якім, паводле Евангелля, рыбным промыслам займаліся яшчэ апосталы Пётр і Андрэй, падкінула навукоўцам чарговую загадку. На дне вадаёма, вядомага таксама як Галілейскае мора, была знойдзена гіганцкая каменная канструкцыя, якая магла быць створана людзьмі каля чатырох тысяч гадоў таму.

Таямнічая структура складзена з базальтавых блокаў і камянёў масай 60 тысяч тон. Канструкцыя дыяметрам 70 метраў і вышынёй 10 метраў мае канічную форму. Паводле слоў экспертаў, піраміда нагадвае манумент, які ўзводзілі на месцы пахавання. Навукоўцы не выключаюць, што ён быў усталяваны тады, калі возера яшчэ не было.

## ЗАПУСК КАРЭЙСКАЙ РАКЕТЫ АДКЛАДАЕЦЦА

Паўночная Карэя перанесла запуск балістычнай ракеты з-за тэхнічных праблем. Пуск паўночнакарэйскай балістычнай ракеты Musudan адкладзены з-за праблем з Windows 8. Паводле звестак аналітыкаў амерыканскіх спецслужбаў, праграмнае забеспячэнне паўночнакарэйскіх ракет да нядаўняга часу грунтавалася на Windows 95. Лідар КНДР Кім Чэн Ын раз'юшаны і мае намер аб'явіць вайну Білу Гейтсу. Пры гэтым яшчэ напярэдадні сакратарыят камітэта КНДР па мірным аб'яднанні радзімы паведаміў, што ваенныя дзеянні на Карэйскім паўвостраве могуць пачацца ў любы момант. Аднак, паводле звестак Пентагона, Пхеньян наўрад ці мае развітыя ядзерныя магчымасці.

ISSN 1990 - 763X

## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## КРЫМ УВЯДЗЕ НОВЫ «КУРОРТНЫ» ПАДАТАК?

У Крыме могуць увесці новы падатак для турыстаў. З такой прапановай выступіў на пасяджэнні пастаяннай камісіі Вярхоўнага Савета Крыма па бюджэтнай, эканамічнай і інвестыцыйнай палітыцы яе кіраўнік Віталь Нахлупін. Узамен адпачывальнікі, лічыць кіраўнік камісіі, павінны атрымаць стандартызацыю турыстычных паслуг і сістэму дысконту і бонусаў — іх прыдумае міністэрства. Паводле слоў чыноўніка, за апошні год Крым наведалі каля шасці мільёнаў турыстаў, але гэта істотна не адбілася на падатковых паступленнях. Сітуацыю павінен выправіць новы падатак. Зрэшты, Нахлупін не ўдакладніў ніякіх падрабязнасцяў — ні працэнтаў, ні меркаванай даты ўвядзення. З 2011 года на тэрыторыі Украіны ўведзены турыстычны збор у адпаведнасці з новым Падатковым кодэксам краіны. Па рашэнні мясцовых уладаў ён можа складаць ад 0,5% да 1% кошту часовага пражывання. У Крыме дзейнічае аднапрацэнтны збор.



## КАРАТКА

З 1 мая 2013 года арганізуецца работа прыгараднага экспрэснага аўтобуснага маршруту нумар 300Э «АВ Цэнтральны — Нацыянальны аэрапорт Мінск» з выкананнем толькі аднаго прамежкавага прыпыначнага пункта — «ст.м. Уручча».

Транспартныя сродкі сельгаспрадпрыемстваў у красавіку — маі змогуць прайсці дзяржаўны тэхнічны агляд без чаргі на ўсіх дыягнастычных станцыях краіны.

Аб'ём шырокай грашовай масы (ШГМ) у Беларусі павялічыўся за студзень — сакавік 2013 г. на 3,7% і на 1 красавіка дасягнуў Br167 трлн 240,8 млрд. Пры гэтым у сакавіку ШГМ прырасла на 1,4%.

Еўразійская эканамічная камісія ўводзіць антыдэмпінгавую пошліну на чыгунныя эмаліяваныя ванны з Кітая ў памеры 51,87 працэнта ад мытнага кошту тэрмінам на пяць гадоў.

Беларусь 12 красавіка ў мэтах выканання сваіх абавязацельстваў па крэдыце стэндбай Міжнароднага валютнага фонду ажыццявіла чарговае пагашэнне асноўнага доўгу ў памеры 64,7 млн СДР, што эквівалентна $97,4 млн.

# БЕЗ ЧАГО ВЫ НЕ ЎЯЎЛЯЕЦЕ СВАЁ ЖЫЦЦЁ?



**Ірына Васіленка, намеснік дырэктара Магілёўскай дзіцячай школы мастацтваў № 2:**

— Не змагу жыць без Радзімы, у гэтым слове для мяне закладзена сапраўды шмат. Я — патрыёт сваёй краіны, і менавіта тут адчуваю сябе асобай. Тут усё дарагое і роднае сэрцу: мая сям'я, сябры і праца. Усё, без чаго няма сэнсу існавання.

Я таксама не ўяўляю сабе жыццё без музыкі, таму што я — чалавек мастацтва, сама пішу вершы і музыку. Музыка для мяне — гэта стан душы і маё жыццё, якое можна распісаць нотамі на паперы. І яшчэ — вера, у шырокім сэнсе. Я веру ў лепшае, у шчасце і ўдачу, у каханне і, вядома, у Бога.



**Алег Хлыстоў, дыктар тэлерадыёкампаніі «Магілёў»:**

— Можна назваць сотні рэчаў, без якіх жыць немагчыма. Напрыклад, без сонца, паветра і вады. Але я маю на ўвазе іншае. На першым месцы ў маім жыцці стаіць сям'я. Мая маці — чалавек, на якога трэба раўняцца. Мая жонка — маё апірышча і карміцелька, мая дачка — працяг майго жыцця і маіх мар. Марыя стала журналісткай, і я ганаруся сваім дзіцем.

Для мяне любімая праца стала другім жыццём. На радыё ў мяне ёсць магчымасць рэалізаваць прыродны талент, і гэта шчасце, што мой голас падабаецца людзям.

А трэцяе — гэта хобі, рыбалка. Прычым я займаюся гэтым у любы сезон і вітаю толькі аматарскую лоўлю рыбы, а не яе здабычу. Мне хочацца застацца сам-насам з прыродай, удалечыні ад урбанізацыі, грукату і пылу.



**Вераніка Мунцян, прадавец кветак:**

— Я абсалютна не ўяўляю сваё жыццё без кветак. Не магу існаваць без гэтай прыгажосці. Я таму вельмі люблю сваю працу, якая стала працягам майго захаплення. Гэта не проста занятасць і заробак, гэта самае найвялікшае задавальненне — прадаваць людзям кветкі. У нашай будзённай шэрасці кветкі дораць радасць. Я цяпер захварэла, але іду на папраўку і толькі і думаю пра тое, што трэба прывезці архідэі і якія цудоўныя яны будуць.

І вядома ж, я не магу жыць без сваёй сям'і — гэта маці, муж, сын і дачка. Што датычыцца нейкіх звычайных рэчаў, накшталт зубной шчоткі, то я здолею жыць без іх вельмі лёгка. А вось сям'я, кветкі і праца — гэта самае дарагое.

**Падрыхтавала Ілона ІВАНОВА.**

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА РАЗГЛЕДЗЕЎ КАДРАВЫЯ ПЫТАННІ

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 12 красавіка разгледзеў кадравыя пытанні. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

***Кіраўнік дзяржавы назначыў:***

**СЯРГЕЕНКУ Ігара Пятровіча** — першым намеснікам Старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь па контрразведвальнай дзейнасці;

**БУСЬКО Ігара Яўгенавіча** — намеснікам Старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь па кадравым забеспячэнні і арганізацыйнай рабоце;

**ЯЗЕРСКАГА Вячаслава Васільевіча** — начальнікам упраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь па Брэсцкай вобласці;

**НЕВЯРОЎСКАГА Аляксандра Віктаравіча** — начальнікам упраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь па Магілёўскай вобласці;

**БУТКЕВІЧА Ігара Яўгенавіча** — першым намеснікам Старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Рэспублікі Беларусь — начальнікам галоўнага апаратыўнага ўпраўлення;

**ГАРАЧКУ Валерыя Сцяпанавіча** — намеснікам Старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Рэспублікі Беларусь — начальнікам галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і кадравага забеспячэння;

**ІГНАТАВА Паўла Уладзіміравіча** — начальнікам упраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Мінскай вобласці;

**ПАДГУРСКАГА Івана Мікалаевіча** — начальнікам Дэпартамента забеспячэння апаратыўна-вышуковай дзейнасці Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь;

**ВАРАНКОВІЧА Уладзіміра Аляксандравіча** — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Балгарыя, Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Грэчаскай Рэспубліцы па сумяшчальніцтве;

**ПРЫМУ Віталя Аляксандравіча** — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Народнай Рэспубліцы Бангладэш па сумяшчальніцтве;

**БЯСКОСТАГА Вячаслава Васільевіча** — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Гана па сумяшчальніцтве.

***Прэзідэнт даў згоду на назначэнне:***

**ЧОРНАГА Анатоля Барысавіча** — першым намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама;

**ЯКАЎЛЕВА Аляксея Уладзіміравіча** — намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама;

**ЦУМАРАВА Уладзіміра Міхайлавіча** — старшынёй Магілёўскага гарвыканкама;

**НАЙДЗЁНА Паўла Іванавіча** — старшынёй Слаўгарадскага райвыканкама;

**ШАЎЧУКА Мікалая Мікалаевіча** — старшынёй Полацкага райвыканкама;

**ЯКАЎЛЕВА Сяргея Уладзіміравіча** — старшынёй Рагачоўскага райвыканкама;

**БУБЕНА Анатоля Анатольевіча** — кіраўніком адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г. Гродна;

**КУРМАНА Івана Іванавіча** — кіраўніком адміністрацыі Ленінскага раёна г. Гродна;

**ЧАДЗЮКА Аляксандра Уладзіміравіча** — пракурорам Магілёўскай вобласці;

**ЧЭРНІКА Васіля Мечаслававіча** — намеснікам Міністра культуры Рэспублікі Беларусь;

**ГАГІЕВА Аляксандра Славіевіча** — першым намеснікам Міністра спорту і турызму Рэспублікі Беларусь;

**ГУРЭВІЧА Валерыя Львовіча** — першым намеснікам Старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь;

**ЗДАНОВІЧА Уладзіміра Мацвеевіча** — дырэктарам Дэпартамента кантролю якасці адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь;

**КОСЦІНА Уладзіміра Барысавіча** — дырэктарам Дэпартамента па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь;

**БАЛБАТОЎСКАГА Генадзя Мікалаевіча** — дырэктарам Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва;

**КАЗАЧОНКА Сяргея Аляксеевіча** — генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Кіруючая кампанія холдынга «Бабруйскаграмаш»;

**ВАШКЕВІЧА Юрыя Эдвардавіча** — генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Кіруючая кампанія холдынга «Лідсельмаш»;

**ПАРХОМЧЫКА Пятра Аляксандравіча** — генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «БелАЗ» — кіруючая кампанія холдынга «БелАЗ-Холдынг»;

**БАРЫСЕНКІ Алега Леанідавіча** — кіраўніком спраў Гомельскага аблвыканкама;

**ЧАБАТАРОВА Анатоля Юр'евіча** — намеснікам дырэктара інфармацыйна-аналітычнага дэпартамента — начальнікам аддзела Выканаўчага камітэта Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

# СКАРОЦЯЦЬ ЧВЭРЦЬ ДЗЯРЖСЛУЖАЧЫХ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Вызваляемым дзяржаўным служачым прадастаўляецца на перыяд да працаўладкавання, але не больш як на 12 месяцаў з дня звальнення, права на адтэрміноўку вяртання (пагашэння) крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю), набыццё жылля, а таксама для аплаты навучання пры атрыманні першай вышэйшай адукацыі іх дзецьмі. Ім таксама прадастаўляецца права на медыцынскае абслугоўванне ва ўстановах здароўя, у якіх яны абслугоўваліся да звальнення.

На шэраг міністэрстваў указам ускладаюцца дадатковыя задачы і функцыі.

Так, на Міністэрства гандлю — у частцы забеспячэння выканання арганізацыямі і грамадзянамі заканадаўства ў сферы гандлю, правядзення адзінай дзяржаўнай палітыкі ў галіне дзяржзакупак тавараў (работ, паслуг), каардынацыі выставачнай і кірмашовай дзейнасці ў краіне, выдачы ліцэнзій на ўвоз і вываз тавараў, уключаных у Адзіны пералік тавараў, да якіх прымяняюцца забароны або абмежаванні на ўвоз або вываз дзяржавамі — членамі Мытнага саюза ў рамках ЕўрАзЭС у гандлі з трэцімі краінамі.

На Міністэрства замежных спраў ускладаюцца дадатковыя задачы і функцыі па каардынацыі развіцця тавараправоднай сеткі, а таксама выставачнай і кірмашовай дзейнасці за мяжой, мытна-тарыфнага і нетарыфнага рэгулявання знешняга гандлю, дзейнасці па ўзаемадзеянні са СГА.

Міністэрства эканомікі возьме на сябе функцыі па каардынацыі ўзаемадзеяння рэспубліканскіх органаў кіравання, іншых дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Савету Міністраў, па пытаннях узаемадзеяння з ЕЭК.

Указам ліквідуецца Рэспубліканскі працоўны арбітраж. У сувязі з гэтым ураду да 1 ліпеня 2013 года неабходна будзе забяспечыць вызначэнне парадку і ўмоў дзейнасці працоўных арбітражаў. Прававы інстытут працоўных арбітражаў, якія непасрэдна вырашаюць калектыўныя працоўныя спрэчкі, будзе захаваны.

Акрамя таго, Савету Міністраў даручана да 1 мая 2013 года ўнесці на разгляд кіраўніка дзяржавы прапановы па павышэнні ўзроўню матэрыяльнага забеспячэння дзяржаўных служачых; сумесна з Адміністрацыяй Прэзідэнта і дзяржаўным сакратарыятам Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь па аптымізацыі існуючай сеткі дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў Рэспублікі Беларусь.

Да 1 ліпеня 2013 года Савету Міністраў даручана ўнесці прапановы па рэфармаванні інстытута натарыята і забяспечыць скарачэнне колькасці работнікаў апаратаў канцэрнаў.

Дзяржаўнаму сакратарыяту Савета Бяспекі да 1 чэрвеня 2013 года неабходна далажыць кіраўніку дзяржавы аб аптымізацыі структуры і скарачэнні колькасці пракурорскіх работнікаў, работнікаў органаў пракуратуры, ваенных судоў і сілавых структур.

Кіраўнікам дзяржаўных органаў, іншых дзяржаўных арганізацый даручана да 1 ліпеня 2013 года прывесці штатныя расклады ў адпаведнасць з указам і пералікам пасад работнікаў, якія ажыццяўляюць тэхнічнае абслугоўванне і забяспечваюць дзейнасць дзяржаўных органаў, якія не належаць да дзяржаўных пасад, што зацвярджаюцца Саветам Міністраў.

Абласным, Мінскаму гарадскому выканаўчым камітэтам да 1 ліпеня 2013 года даручаецца прывесці сваю структуру і забяспечыць прывядзенне структуры гарадскіх, раённых выканаўчых камітэтаў, мясцовых адміністрацый раёнаў у гарадах у адпаведнасць з гэтым указам.

Старшыням абласных выканаўчых камітэтаў неабходна ў 2013 годзе забяспечыць аптымізацыю колькасці сельскіх (пасялковых) выканкамаў, а таксама колькасці іх работнікаў.

Акрамя таго, Савету Міністраў да 1 студзеня 2014 года неабходна забяспечыць аптымізацыю сістэмы дзяржаўных устаноў, непасрэдна падпарадкаваных рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, і скарачэнне колькасці работнікаў, якія фінансуюцца з бюджэту, у цэлым на 25 працэнтаў.

Персанальная адказнасць за правядзенне аптымізацыі колькасці дзяржслужачых, прымяненне падстаў іх звальнення ўскладзена на кіраўнікоў адпаведных дзяржаўных органаў, іншых дзяржаўных арганізацый. Названыя кіраўнікі абавязаны прыняць меры па працаўладкаванні дзяржаўных служачых, якія падлягаюць вызваленню пры рэалізацыі гэтага ўказа, з улікам іх прафесіі, кваліфікацыі і раней займаемай пасады, у тым ліку шляхам пераводу на іншую, не звязаную з дзяржаўнай службай работу.

Указ уступае ў сілу з 12 красавіка 2013 года і прадугледжвае правядзенне асноўных працэдур па аптымізацыі сістэмы дзяржаўных органаў і іншых дзяржаўных арганізацый, а таксама колькасці іх работнікаў да 1 ліпеня гэтага года.

# СТАЛІЧНАЯ АРЭНДА ПРАЦЯГВАЕ ДАРАЖЭЦЬ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Часткова гэта сапраўды так. Але трэба ўлічваць, што падобныя кватэры далёка не лепшай якасці і яны здаюцца выключна на сезон. Потым у верасні—кастрычніку сям'я зноў будзе вымушана шукаць сабе ўжо іншае жыллё, кошты на якое могуць яшчэ павялічыцца. Справа ў тым, што менавіта ў жніўні—верасні ў Мінску назіраецца студэнцкі бум, які «вымывае» ўжо любое ліквіднае жыллё.

**Звычайна гаспадары жылля шкадуюць сваіх «старых» кватарантаў і не вельмі сур'ёзна павялічваюць цэннік арэнды.**

Спадарыня Лукашэвіч адзначае яшчэ адзін факт, калі гаспадары ліквідных кватэр патрабуюць ад агенцтваў у першую чаргу шукаць ім кватарантаў, што з'яўляюцца сям'ёй у зарэгістраваным шлюбе, без дзяцей і без жывёл. А вось сям'і з двaімі малымі дзеткамі знайсці сабе якасную і недарагую кватэру стала вельмі праблематычна.

## СЕЗОН АРЭНДЫ ЗАГАРАДНАЙ НЕРУХОМАСЦІ ПАЧНЕЦЦА Ў МАІ

Звычайна пошук жылля для веснавога і летняга адпачынку пачынаецца ўжо ў сакавіку. Аднак сёлета зіма ў нас гаспадарыла нават і ў першыя дні красавіка, калі ўначы было даволі холадна.

Раней добрым попытам карысталіся нават звычайныя садовыя домікі па кошце ад 80 да 120 долараў за месяц. Аднак цяпер кліент стаў больш далікатны, і яму неабходна прапанаваць больш камфорту, а не толькі водаправод на вуліцы і прыбіральню ў двары. Попыт на адпачынак у такіх спартанскіх умовах зараз мінімальны, але і па такіх дачах цэннік цяпер падрос да 150—200 долараў.

Агенцтвы зараз больш займаюцца арэндай катэджаў і жылых дамкоў побач з цудоўнай прыродай. Звычайна кліенты выбіраюць загараднае жыллё ў пасёлках з развітай інфраструктурай, адлегласць якіх ад Мінска складае да 50—70 кіламетраў. Кошты на параўнальна бюджэтныя, але камфартабельныя дамкі складаюць 300—400 долараў за месяц.

Больш якасныя катэджы ў Тарасава, вёсцы Аксакаўшчына і побач з Бараўлянамі каштуюць ужо не менш за 500—700 долараў. Сапраўды якаснае загараднае жыллё каштуе больш за тысячу долараў, а элітныя катэджы прапануюцца кліентам нават за 5—6 тысяч долараў за месяц. Гэта ўжо сапраўды шыкоўныя катэджы з сучаснай мэбляй, усёй неабходнай бытавой тэхнікай, з басейнамі і лазнямі.

## АРЭНДА КВАТЭР БУДЗЕ ДАРАЖЭЦЬ І НАДАЛЕЙ

Пакуль у Мінску захоўваецца дэфіцыт здымнага жылля, то і цэннік на яго будзе толькі павялічвацца, упэўнена Аксана Лукашэвіч. А вось памяншэнне арэндных коштаў магчыма толькі ў двух выпадках. Па-першае, каб гэта адбылося, неабходна пачаць масавае будаўніцтва цэлых жылых кварталаў у межах сталіцы або ў бліжэйшым прыгарадзе. Потым падобнае недарагое жыллё на нейкі час трапіць і ў ранг арэндных кватэр. Існуе і другі, прынцыпова новы метад абмежавання арэндных коштаў. Гэта правядзенне дзяржаўнай стандартыфікацыі арэндных кватэр. Згодна з такой стандартыфікацыяй, здаваць у арэнду кватэры па вялікім цэнніку магчыма будзе толькі ў тым выпадку, калі гэтае жыллё пачне адпавядаць пэўным стандартам па плошчы, якасці рамонту, наяўнасці бытавой тэхнікі і г.д. За здачу ў арэнду больш якасных кватэр уладальнікі падобнага жылля ва ўсім свеце плацяць значна большыя падаткі ў мясцовы бюджэт. Існуе яшчэ адзін момант, калі на рынку арэнды з'явіцца дзяржаўная ці нейкая муніцыпальная структура з вялікімі аб'ёмамі здымнага жылля.

**Падаражэла арэнда і асобных пакояў, цэннік якіх сёння складае 150—200 долараў.**

**Летам на рынку арэнды павінна з'явіцца таннейшае жыллё (270—290 USD) «ад бабуль», якія ў цёплы сезон жывуць на дачах.**

**Сяргей КУРКАЧ.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## СЕЯЦЬ ТРЭБА ХУТКА

**Першымі сяўбу на Брэстчыне пачалі аграрыі Іванаўскага, Кобрынскага, Пінскага, Бярозаўскага раёнаў. А ў паўднёвых раёнах — Брэсцкім, Маларыцкім, якія звычайна пачыналі гэту кампанію, сельскагаспадарчым агрэгатам пакуль перашкаджае вада. Але за выхадныя, гавораць спецыялісты, выйдуць у поле земляробы большасці раёнаў. Бо прагназуецца павышэнне тэмпературы паветра.**

Для параўнання: летась у вобласці да 10 красавіка пасеялі ўжо раннія збожжавыя культуры, а цяпер да гэтай даты нават не пачыналі. Таму давядзецца трымаць напружаны тэмп. Як сказаў намеснік старшыні аблсельгасхарчу Аляксей Трацюк, неабходна максімальна задзейнічаць усе тэхнічныя магчымасці гаспадарак, магчыма, нават працаваць круглыя суткі.

Паўсюдна пачалася падкормка азімых, сенажацяў і пашы. Разглядаецца пытанне па прыцягненні да гэтай работы авіяцыі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ЗАЛАТЫЯ МЕДАЛІ СПАРТСМЕНКІ З ПРЫДЗВІННЯ

**Адразу тры залатыя медалі заваявала на чэмпіянаце Еўропы па цяжкай атлетыцы, які праходзіць у Албаніі, 19-гадовая беларуска Алена Чычкан.**

Член нацыянальнай зборнай каманды Рэспублікі Беларусь па цяжкай атлетыцы ў вагавай катэгорыі да 58 кілаграмаў заваявала адразу тры залатыя медалі: у практыкаванні «рывок» (95 кг) і «штуршок» 118 кг, а таксама па суме двух практыкаванняў (213 кг).

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Косінец накіраваў віншавальную тэлеграму заслужанаму трэнеру Рэспублікі Беларусь Віктару Шаршукову і Алене Чычкан. У ёй асабліва падкрэсліваецца, што Віктар Яўгенавіч — адзін з лепшых трэнераў Прыдзвінскага краю. Ён ужо выхаваў сярэбранага прызёра Алімпійскіх гульняў 2004 года ў Афінах — Ганну Бацюшку, прызёраў і пераможцаў спартыўных першынстваў свету і Еўропы.

«Дзякуючы вам мы заўважылі Алену Чычкан як перспектыўнага цяжкаатлета і ўключылі яе ў лік стыпендыятаў Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта, — адзначана ў віншавальным лісце. — Шчыра ўдзячны за годнае прадстаўніцтва Беларусі і Віцебскай вобласці на еўрапейскім спартыўным форуме, праяўленую волю да перамогі і ўменне працаваць на вынік».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## 400 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ ЗА... АДНУ SMS

**У Гродне на вуду махляра трапіў непаўналетні мясцовы жыхар, якому віртуальны знаёмы прапанаваў павысіць рэйтынг у сацыяльнай сетцы «УКантакце».**

Паводле інфармацыі начальніка аддзялення Гродзенскага міжраённага аддзела Следчага камітэта падпалкоўніка міліцыі Аляксея Шыціка, малады чалавек пазнаёміўся праз інтэрнэт з карыстальнікам пад нікам «Вася Дураў» і нейкі час з ім перапісваўся. А затым гродзенцу паступіла вышэйзгаданая прапанова павысіць рэйтынг. Для гэтага юнак паведаміў «Васю Дураву» нумар свайго тэлефона, на які неўзабаве прыйшла SMS: каб завяршыць працэдуру «павышэння рэйтынгу», трэба было адказаць «Так» на пэўны нумар. Пасля чаго з балансу рахунку гродзенца спісалася каля 400 тысяч рублёў. Дарэчы, аферыст спрабаваў таксама выведаць нумары тэлефонаў яго бацькоў.

SMS-паведамленне прыйшло з нумара «5555». Каб не стаць ахвярай махляра, будзьце ўважлівыя і пра падобныя спробы тэрмінова паведамляйце ў міліцыю, рэкамендуе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## МАТУЛЯ НЕ ВЫТРЫМАЛА

**Больш чым 7 мільёнаў 30-гадовы жыхар Рэчыцы выручыў за здачу кватэры. Грошы з арандатараў ён узяў на год наперад. І ўсё б нічога, толькі вось кватэра гэта належала яго роднай маці. Пакуль жанчына была на працы, сынок па аб'яве знайшоў ахвотнікаў зняць жыллё. Пры гэтым гаспадыня здаваць кватэру нікому не збіралася. І таму, калі вечарам пасля работы ўбачыла ў кватэры чужыя рэчы, звярнулася ў мясцовае аддзяленне міліцыі, каб ёй дапамаглі знайсці сына. Ён, дарэчы, атрымаўшы грошы, знік у невядомым напрамку.**

Куды — давялося шукаць аператыўнікам Рэчыцкага РАУС, якія хутка высветлілі шляхі маладога чалавека. Як расказаў начальнік аддзела крымінальнага вышуку Сяргей Савенка, грамадзянін з'ехаў у Гомель, зняў нумар у гасцініцы і пачаў раскідацца грашыма. За некалькі дзён ён паспеў спусціць амаль усё «заробленае» на здачы кватэры. Дарэчы, маці такому «труку» свайго дзіцяці не вельмі здзівілася. Справа ў тым, што сынок ужо адбыў «тэрмін» за аналагічнае злачынства. Не прайшло і месяца, як ён вярнуўся з месцаў пазбаўлення волі, дзе сядзеў за махлярства. Працу не шукаў, а ўспомніў «надзейны» спосаб узбагачэння. Але ж зноў не атрымалася. Праўда, калі мінулы раз у міліцыю звярталіся ашуканыя кватэраздымшчыкі, то цяпер прыструніць сына вырашыла сама матуля. Заведзена крымінальная справа. Верагодна, што на гэты раз хлопец атрымае больш суровае пакаранне за падман не толькі незнаёмых, але і самага блізкага чалавека.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ГРОШЫ НА МАДЭРНІЗАЦЫЮ — ПРАЗ ПРОДАЖ АКЦЫЙ

**У рэдкага беларуса навагодні стол абыходзіцца без бутэлькі шампанскага. Буйнейшым айчынным вытворцам гэтага напоя па-ранейшаму застаецца Мінскі завод пеністых вінаў. Як і шмат іншых беларускіх прадпрыемстваў, яго ў бліжэйшай будучыні чакае мадэрнізацыя. Грошы на яе правядзенне плануецца здабыць праз продаж амаль 75 тысяч акцый. Набыць іх зможа любы грамадзянін краіны ці юрыдычная асоба, якая мае рэгістрацыю ў краіне і на якую распаўсюджваецца беларускае заканадаўства.**

— Гэта ўжо другі выпуск каштоўных папер завода. Шырокаму колу асоб 240 тысяч акцый прадпрыемства былі прапанаваны яшчэ год таму. З іх нам удалося размясціць амаль 165 тысяч, — аналізуе сітуацыю **генеральны дырэктар ЗАТ «Мінскі завод пеністых вінаў» Леанід КРАЎЧУК**. — Прэзідыум Савета Міністраў краіны адзначыў выніковасць такога праекта, які атрымаў назву «народнае IPO». Большасць атрыманых сродкаў пайшла на пагашэнне крэдытаў. Зараз жа завод чакае мадэрнізацыя да еўрапейскага ўзроўню.

Продаж акцый стартуе 16 красавіка і скончыцца 14 чэрвеня. У адны рукі адпусцяць да тысячы каштоўных папер. Кошт кожнай з іх складзе 285650 рублёў. Але, як паведаміла **начальнік упраўлення дзяржаўнай уласнасці канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Ала САКАЛОЎСКАЯ,** набыць іх можна ўжо зараз. Дастаткова толькі падаць заяўку ў банк. Аднак прададуць іх толькі за беларускія рублі.

Калі завод здолее распрадаць усе акцыі, то атрымае за іх 21,5 мільярда рублёў. Сродкі пойдуць на пераўзбраенне прадпрыемства. Мяркуецца, што на паліцах крам будзе з'яўляцца ўсё больш бутэлек, закаркаваных менавіта драўлянымі коркамі — так павялічыцца тэрмін захоўвання віна. А поліэтыленавыя коркі паціху адыдуць у гісторыю. Акрамя таго, замена чакае фізічна састарэлыя ёмістасці, якія выкарыстоўваюцца дзеля прыгатавання лікёраў. Трэцім напрамкам мадэрнізацыі прадпрыемства стане набыццё і мантаж абсталявання для выпуску мюзле, якое ўтрымлівае корак на бутэльцы шампанскага. Дзякуючы ўсім гэтым захадам скароцяцца агульныя выдаткі завода.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ПАРТЫЯ КАКАІНУ НА 150 ТЫСЯЧ ДОЛАРАЎ

**У Оршы супрацоўнікі міліцыі затрымалі аўто, на якім з Польшчы везлі какаін коштам каля 150 тысяч долараў.**

— Падчас правядзення комплексу мерапрыемстваў па спыненні транзіту наркатычных сродкаў праз тэрыторыю Беларусі з Польшчы ў Расійскую Федэрацыю супрацоўнікамі міліцыі ў Оршы затрымана аўтамашына «Опель-Астра», якой кіраваў непрацуючы мясцовы жыхар, — паведамілі ва ўпраўленні ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама. — У салоне машыны быў знойдзены і канфіскаваны асабліва небяспечны наркатычны сродак 149 грамаў какаіну. Пры правядзенні вобыску па месцы жыхарства кіроўцы дадаткова канфіскавалі больш за 463 грамы аналагічнага рэчыва. Агульная вага канфіскаванага какаіну склала 613,59 грама.

Быў затрыманы і арганізатар канала перамяшчэння какаіну — непрацуючы жыхар Магілёва 1966 года нараджэння.

Заведзена крымінальная справа па артыкуле Крымінальнага кодэкса, які прадугледжвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін ад 8 да 12 гадоў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ З нагоды

# ВАРТАВЫЯ НЕБА

## 14 красавіка — Дзень войскаў супрацьпаветранай абароны

**Гісторыя супрацьпаветранай абароны краіны пачынаецца ў лістападзе 1941 года, калі ў Куйбышаве была сфарміравана 5-я дывізія супрацьпаветранай абароны, якая пазней стала родапачынальніцай 2-й асобнай арміі СПА Беларусі. За гады Вялікай Айчыннай вайны прадстаўнікі гэтага роду войск сталі сапраўднымі героямі: імі было збіта больш за 7500 самалётаў, знішчана звыш 1000 танкаў, каля 1500 гармат і іншай баявой тэхнікі праціўніка.**

Цяпер гераічныя традыцыі франтавікоў працягвае сучаснае пакаленне абаронцаў паветраных межаў Беларусі. На шчасце, сённяшнім вайскоўцам не прыходзіцца страляць на паражэнне. Аднак яны кожную хвіліну трымаюць руку на пульсе. І дапамагаюць ім несці адказную службу сучасныя зенітныя ракетныя і радыёлакацыйныя комплексы, здольныя выяўляць і паражаць сродкі паветранага нападу ва ўсім дыяпазоне вышынь і хуткасцяў.

— Узбраенне, якое сёння знаходзіцца ў воінскіх часцях, з'яўляецца высокатэхналагічным і калектыўна выкарыстоўваецца нашымі баявымі разлікамі, — зазначыў **камандуючы Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі супрацьпаветранай абароны Узброеных Сіл Беларусі Алег ДВІГАЛЕЎ.** — Невыпадкова мы шмат увагі надаём падрыхтоўцы нашых спецыялістаў. Паколькі менавіта ў руках спецыяліста-прафесіянала тэхніка можа выканаць пастаўленыя задачы.

Штодзень баявое дзяжурства па супрацьпаветранай абароне ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь нясуць больш за 500 ваеннаслужачых і асоб грамадзянскага персаналу. Асабовы склад дзяжурных змен кожны дзень суправаджае больш за 400 паветраных судоў.

Ва ўмовах сучаснага ваенна-палітычнага становішча з мэтай забеспячэння рэгіянальнай бяспекі Рэспубліка Беларусь і Расійская Федэрацыя праводзяць сумесную абарончую палітыку, адным з кірункаў якой з'яўляецца ўдасканаленне функцыянавання рэгіянальнай групоўкі войскаў. Важным элементам гэтай групоўкі павінна стаць Адзіная рэгіянальная сістэма супрацьпаветранай абароны дзвюх краін.

Сёння асаблівая ўвага надаецца пытанням мадэрнізацыі ўзбраення і ваеннай тэхнікі. З арыентацыяй на новыя тэхналогіі з улікам магчымасцяў абаронча-прамысловага комплексу. Асноўныя кірункі мадэрнізацыі — паляпшэнне тактыка-тэхнічных характарыстык і памехаабароненасці ўзбраення, пашырэнне кола задач, якія яно вырашае, і максімальная аўтаматызацыя працэсаў кіравання.

— Усе работы па мадэрнізацыі ўзбраення і ваеннай тэхнікі, выкананыя ў апошнія 5 гадоў, дазволілі нам перайсці да цалкам аўтаматызаваных спосабаў выдачы радыёлакацыйнай інфармацыі, — паведаміў **начальнік упраўлення радыётэхнічных войскаў камандавання Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны палкоўнік Ігар НАСІБЯНЦ**. — Мы дасягнулі высокай якасці выяўлення паветраных цэляў, іх суправаджэння і выдачы інфармацыі на камандныя пункты, якія ажыццяўляюць кантроль паветранай прасторы. У бліжэйшыя гады, у адпаведнасці з тымі планамі, якімі мы кіруемся, пераўзбраенне будзе тычыцца ўсіх падраздзяленняў радыётэхнічных войск. Сёння мадэрнізавана больш за 30% радыёлакацыйнага ўзбраення і комплексаў сродкаў аўтаматызацыі, што прывяло да павышэння надзейнасці тэхнікі, якасці атрыманай інфармацыі і палягчэння працы персаналу.

**На шчасце, сённяшнім вайскоўцам не прыходзіцца страляць на паражэнне. Аднак яны кожную хвіліну трымаюць руку на пульсе.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**У камандным пункце радыётэхнічнага батальёна № 2288.**

Сёння на ўзбраенні Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны знаходзяцца комплексы сродкаў аўтаматызаванага кіравання беларускай вытворчасці «Бор», «Паляна-РБ», «Нёман», «Спрут», «Рыф-Р», «Раса-РБ». У бліжэйшы час паступіць і радыёлакацыйная станцыя «Усход», якая распрацавана беларускім канструктарскім бюро «Радар». Зараз «Усход» знаходзіцца на стадыі дзяржаўных выпрабаванняў, якія плануюцца завяршыць у маі. Упершыню станцыя была апрабавана ва ўмовах палігона ў 2009 годзе і ўжо тады зарэкамендавала сябе з найлепшага боку. Летась яна выкарыстоўвалася падчас сумесных беларуска-расійскіх вучэнняў на палігоне Ашулук, дзе паказала свае высокія тэхнічныя характарыстыкі.

Адначасова вядзецца работа і па далейшай мадэрнізацыі знішчальнай авіяцыі — у прыватнасці, самалётаў МіГ-29. Як дабавіў Алег Двігалеў, у 2015 годзе будзе рэалізавана закупка вучэбна-баявых самалётаў Як-130, што дазволіць выйсці на новы ўзровень падрыхтоўкі лётнага складу. У радыётэхнічныя войскі Міністэрствам абароны плануецца закупка сучасных радыёлакацыйных станцый «Праціўнік» вытворчасці Расійскай Федэрацыі.

Нагадаем, летась на ўзбраенне 120-й зенітнай ракетнай брыгады Заходняга аператыўна-тактычнага камандавання паступілі 2 батарэі новага для беларускай арміі зенітна-ракетнага комплексу «Тор-М2». Сёлета лічыцца мэтазгодным закупіць і 3-ю такую батарэю.

**Вераніка КАНЮТА** ■

**ЗАО «Идея Банк» информирует вкладчиков**
**об изменении с 12.05.2013 процентных ставок по действующим депозитам физических лиц.**
Подробная информация на сайте: www.ideabank.by
и по телефонам (017) 306 33 15, 7555 (с мобильных телефонов).
*ЗАО «Идея Банк», лицензия №25 от 13.12.2013, выдана НБРБ, УНП 807000122*

**ОАО «Белхим»** сообщает о решении общего открытого собрания акционеров о выплате дивидендов за 2012 год:
• Период выплаты с 15.04.2013 года по 15.06.2013 года;
• Порядок выплаты дивидендов — путем зачисления на лицевые счета акционеров.
УНП 100122846

БЕЛИНВЕСТБАНК
Внимание! Акция!
ОАО «Белинвестбанк» до 1 июля 2013 года проводит акцию по досрочному погашению кредитов на потребительские нужды, выданных в белорусских рублях, процентная ставка по которым установлена в размере не более действующей ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь (включительно).
Дополнительную информацию можно получить в отделениях ОАО «Белинвестбанк» и по телефонам
146 КОНТАКТ-ЦЕНТР либо 8 (017) 239-02-39
www.belinvestbank.by
Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк» 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29 УНП 807000028
Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь №3 от 27.10.2006

■ Кватэрнае пытанне

## ЛЮБІШ ЕЗДЗІЦЬ, ЛЮБІ І САНАЧКІ ЦЯГАЦЬ

**Наша суседка, мякка кажучы, выпівае, не плаціць за камунальныя паслугі. Згодна з ранейшым Жыллёвым кодэксам яе не маглі за гэта выселіць з прыватызаванай кватэры. Па новым, кажуць, можна. А як гэта будзе выглядаць?**

**А. Д., г. Пінск.**

Згодна з арт. 155 новага ЖК, калі ўласнік жылога памяшкання без уважлівых прычын мае 6-месячную запазычанасць па плаце за жыллёва-камунальныя паслугі, мясцовы выканаўчы і распарадчы орган абавязаны ў пісьмовай форме папярэдзіць уласніка аб неабходнасці пагасіць запазычанасць. Калі ўласнік на працягу аднаго месяца з даты атрымання папярэджання не пагасіў запазычанасць па плаце за жыллёва-камунальныя паслугі ў поўным аб'ёме, а магчымасці пагашэння доўгу за кошт іншай маёмасці, якая знаходзіцца ў яго ўласнасці, няма, мясцовы выканаўчы і распарадчы орган мае права падаць у суд іск аб прымусе ўласніка жылога памяшкання да адчужэння жылога памяшкання.

У выпадку прыняцця судом такога рашэння гэты ўласнік абавязаны ажыццявіць адчужэнне жылога памяшкання на працягу года з моманту ўваходжання ў законную сілу рашэння суда. Калі на працягу гэтага тэрміну ўласнікам жылога памяшкання пагашана запазычанасць па плаце за жыллёва-камунальныя паслугі ў поўным аб'ёме, выканаўчая вытворчасць па гэтай справе спыняецца.

Калі ж на працягу года пасля ўваходжання ў законную сілу рашэння суда аб прымусе ўласніка да адчужэння жылога памяшкання гэтае жылое памяшканне не было адчужана, мясцовы выканаўчы і распарадчы орган мае права падаць у суд іск аб прымусовым продажы гэтага жылога памяшкання. Пры прыняцці судом такога рашэння жылое памяшканне падлягае прымусоваму продажу з публічных таргоў.

У выніку, у выпадку прымусовага продажу жылога памяшкання былому ўласніку жылога памяшкання мясцовым выканаўчым і распарадчым органам на працягу двух месяцаў перадаецца ва ўласнасць іншае жылое памяшканне (па агульнай плошчы меншае за займанае жылое памяшканне і (або) якое саступае яму па сваіх спажывецкіх якасцях, у тым ліку ў іншым населеным пункце, а ў сельскай мясцовасці — за межамі тэрыторыі сельсавета, на якой знаходзілася прададзенае жылое памяшканне), а таксама ў парадку, вызначаным заканадаўствам, выплачваецца кошт прададзенага жылога памяшкання за вылікам кошту жылога памяшкання, што перадаецца ва ўласнасць, затрат на адчужэнне жылога памяшкання і пагашэнне запазычанасці па плаце за жыллёва-камунальныя паслугі. Пры гэтым сума запазычанасці па плаце за жыллёва-камунальныя паслугі накіроўваецца арганізацыям, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю жыллёвага фонду і (або) аказваюць жыллёва-камунальныя паслугі.

Пры адмове былога ўласніка жылога памяшкання і членаў, былых членаў яго сям'і, якія пражываюць сумесна з ім, вызваліць прададзенае з публічных таргоў жылое памяшканне, яны падлягаюць высяленню ў судовым парадку ў іншае жылое памяшканне, перададзенае былому ўласніку.

## ПРЫ БУДАЎНІЦТВЕ ЧЭКАМІ СКАРЫСТАЦЦА МОЖНА, ПРЫ АДСТРОЙВАННІ — НЕ

**Мы пабудавалі кватэру па долевым удзеле з выкарыстаннем банкаўскага крэдыту. Дом прыняты ў эксплуатацыю, але жыць у кватэры яшчэ нельга, бо там няма ніякай унутранай апрацоўкі. Каб зрабіць яе — паклaсці плітку, паклеіць шпалеры, насцаць лінолеум на падлогі і г.д. — патрэбны грошы. Чэкамі «Жыллё» на гэтыя мэты скарыстацца можна?**

**Л. Мельнік, г. Мінск.**

У адпаведнасці з п. 1 арт. 143 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь імянныя прыватызацыйныя чэкі «Жыллё» выкарыстоўваюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь для прыватызацыі жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду, якія яны займаюць, а таксама грамадзянамі і членамі іх сем'яў, якія знаходзяцца на ўліку асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў — для выплаты паявога ўзносу ў жыллёвым або жыллёва-будаўнічым кааператыве, фінансаванні індывідуальнага або калектыўнага жыллёвага будаўніцтва; рэканструкцыі блакіраваных, аднакватэрных жылых дамоў; долевага ўдзелу ў жыллёвым будаўніцтве, набыцця жылых памяшканняў шляхам пакупкі, пагашэння запазычанасці па крэдытах банкаў (уключаючы выплату працэнтаў за карыстанне імі) і пазыках арганізацый, узятых і выкарыстаных на названыя мэты.

У дадзеным выпадку дом у вызначаным парадку ўжо прыняты ў эксплуатацыю і магчымасці выкарыстання чэкаў «Жыллё» на фінансаванне работ па завяршэнні ўнутранага адстройвання дзейнае заканадаўства не прадугледжвае. Акрамя таго, сям'я, якая пабудавала жыллё, падлягае знняццю з уліку асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў.

**Віктар САВІЦКІ.**

■ Роздум над пісьмом

# ВОСТРАЎСКАЯ ШКОЛА: ЗАКРЫЦЬ НЕЛЬГА ПАКІНУЦЬ

**Ліст у рэдакцыю даслала наша пастаянная чытачка Ірына Міхайлаўна Рудкоўская. Яна заклапочана лёсам школы ў вёсцы, дзе нарадзілася.** *«...Навісла пагроза закрыцця і Вострaўскай школы-сада, якая носіць з 1992 года імя Міхася Рудкоўскага і ў якой працуе музей паэта. Некалькі гадоў таму ў яе ўлілася Нацкая школа. Вострaўская цяпер — адзіная ўстанова адукацыі ў той частцы Ганцавіцкага раёна, якая мяжуе з Міншчынай. Раней ішлі размовы, якую з дзвюх школ закрыць: Вострaўскую ці Кукаўскую. Выходзіць — Вострaўскую, бо ў ёй на некалькі вучняў менш. А што Вострaўская не зусім звычайная, што там працуе музей, вядомы не толькі ў сваім раёне, але і ў суседняй вобласці, ніхто не ўлічвае...»* **Далей Ірына Міхайлаўна нагадвае, што М. Рудкоўскі — першы прафесійны паэт Ганцаўшчыны, ён адзіны з Брэстчыны ў 60 гады быў прыняты ў Саюз пісьменнікаў СССР. І школа з літаратурным музеем — лепшая магчымасць годна падтрымліваць памяць пра вядомага паэта.**

Па просьбе карэспандэнта газеты пісьмо пракаментавала начальнік раённага аддзела адукацыі Ніна Здрок. «Імя Міхася Рудкоўскага ўвекавечана на алеі пісьменства ў райцэнтры. У 2011 годзе праведзены рамонт музея, штогод абнаўляюцца яго экспазіцыі. У сценах музея пастаянна праводзяцца школьныя і раённыя мерапрыемствы. За час работы музея, які быў заснаваны ў 1993 годзе, яго наведалі каля 5000 чалавек. Толькі ў 2011 годзе праведзена 34 экскурсіі. Падчас святкавання Дня беларускага пісьменства ў музеі пабывалі не толькі беларускія, але і замежныя госці. Пастаяннымі наведнікамі музея з'яўляюцца вучні ўстаноў адукацыі нашага і Клецкага раёнаў», — пагаджаецца яна. І дадае, што раённы выканаўчы камітэт не разглядаў пытанне аб закрыцці ў 2013 годзе Вострaўскага яслі-сада — сярэдняй школы імя М. Рудкоўскага.

Рашэнне не прынята, значыць, з 1 верасня школу не закрыюць. Але прыняць такое рашэнне — справа аднаго альбо некалькіх дзён. Аўтар пісьма, настаўнікі школы, вучні бацькоў хвалююцца за будучы — 2014 — год. Тым больш што ва ўстанове адукацыі сёння навучаецца 54 дзіцяці, выхоўваецца 4 дашкольнікі. У гэтым навучальным годзе няма чацвёртага класа, налета, значыць, не будзе пятага.

Працэс закрыцця вясковых школ ідзе, абумоўлены ён найперш дэмаграфічнай сітуацыяй. На выніковай калегіі Брэсцкага абласнога ўпраўлення адукацыі яго начальнік Міхаіл Ціханчук аб'явіў аб намеры закрыць сёлета 19 малакамплектных школ у вобласці. Кіраўнік адукацыйнай галіны адзначыў, што ў першую чаргу будуць закрывацца школы, дзе вучацца менш за 50 дзяцей. Бо затраты на ўтрыманне аднаго вучня ў такой школе большыя за сярэднеабласны паказчык у 1,5- 4 разы.

Цалкам верагодна, што праз год-другі паўстане пытанне і па Вострaўскай школе. Лічбы ўжо цяпер набліжаюцца да той крытычнай адзнакі, за якой прымаецца рашэнне. Пасля згаданай пастановы, як правіла, вырашаецца пытанне аб падвозе дзяцей у іншыя школы, прапаноўваецца праца настаўнікам. Тэарэтычна ўсё выглядае як быццам бы гладка. А ў жыцці... нярэдка абарочваецца сапраўднай драмай. Ну хоць бы таму, што закрыццё школы — пачатак згасання вёскі. Цяперашні дэпутат Палаты прадстаўнікоў нашага парламента, былы старшыня Пружанскага райвыканкама Аляксандр Юркевіч не раз гаварыў: «Зачынілі школу, з'ехалі з вёскі настаўнікі — пачынай адлік, колькі гэтай вёсцы засталося». Аляксандр Іванавіч, як мог, супраціўляўся такой «аптымізацыі», не даваў закрываць школы, нават паштовыя аддзяленні пакідаў. На свой страх і рызыку прымаў рашэнні аб аб'яднаных класах, толькі б засталася школа. Але для такіх учынкаў патрэбна цвёрдая пазіцыя кіраўніка, ну і пажадана, каб раён быў недатацыйны.

> **Тэарэтычна ўсё выглядае як быццам бы гладка. А ў жыцці... нярэдка абарочваецца сапраўднай драмай. Ну хоць бы таму, што закрыццё школы — пачатак згасання вёскі.**

Згадваецца яшчэ адна гісторыя з практыкі закрыцця сельскіх устаноў, на гэты раз у Жабінкаўскім раёне. Той выпадак можна ахарактарызаваць як сумна-кур'ёзны. Больш за дзесяць гадоў таму на сельскі сход прыехала аўтарытэтная камісія з раёна, каб пераканаць жыхароў, «як ім будзе добра», калі закрыюць маленькую ўчастковую бальніцу, а дапамогу будуць аказваць у раённай — на больш высокім узроўні. Словы, узятыя ў двукоссе, належаць старасце вёскі. Яна першай расказвала аўтару гэтых радкоў тую гісторыю, потым пацвердзіў і старшыня райвыканкама, які быў на сходзе. Дык вось, у разгар гутаркі з суседняга дома прыбегла жанчына: яе мужу стала дрэнна з сэрцам. У зале знаходзілася некалькі ўрачоў, зразумела, чалавеку імгненна аказалі кваліфікаваную дапамогу і адправілі ў бальніцу. Потым прызналі: каб дапамога спазнілася хаця б на паўгадзіны, ратаваць пацыента наўрад ці ўдалося б. Тады бальніцу не закрылі, ні ў каго не паднялася рука падпісаць патрэбныя дакументы. Закрылі праз год ці паўтара...

Сапраўды, растлумачыць можна ўсё. Не праблема — знайсці патрэбныя факты і аргументы, каб паказаць, будзе лепш, бо паслугі медыцыны, адукацыі, культуры людзі атрымаюць у іншым месцы на больш высокім узроўні. Але насамрэч, ні ў адной вёсцы не стала лепш ад таго, што закрылі школу, ФАП альбо пошту. А Вострaўская школа — славутасць вёскі, яе ўпрыгажэнне. Тыповы двухпавярховы будынак, як сказана ў пісьме аддзела адукацыі, нядаўна перажыў рамонт. У ім ёсць спартыўная зала з раздзявальнямі, душавымі і санвузлом, сучасны харчовы блок, светлыя і ўтульныя вучэбныя кабінеты. Калектыў складаецца з 20 педагогаў. Ніводзін з настаўнікаў, дарэчы, не мае нават 50 гадоў. Дырэктар школы Святлана Навіцкая сказала, што нідзе на афіцыйным узроўні пра закрыццё іх школы не гаварылася. І яны з калегамі вельмі спадзяюцца, што школа застанецца. Можа, мясцовы СВК пачне развіваць вытворчасць, прыедуць людзі на працу. А можа, які прадпрымальнік адкрые прадпрыемства, створыць рабочыя месцы ў вёсцы, моладзь не так актыўна будзе з'язджаць. У садку зараз чацвёра дзяцей, а хутка будзе шасцёра, на двух малых матулі рыхтуюць неабходныя дакументы. Святлана Цімафееўна ведае кожнага маленькага жыхара вёскі. Зараз у Востраве жыве крыху больш за 300 чалавек. Дзяцей яшчэ возяць з суседняй вёскі Нач.

Дзякуючы школьнаму музею Востраў наведваюць госці. Тут няма якой-небудзь кавярні, але гасцей гатовы смачна накарміць у школьнай сталоўцы, патрэбен толькі папярэдні заказ. У школе традыцыйна ладзяцца раённыя мерапрыемствы, бо школа адметная. Таму ўсе спадзяюцца, што коска (глядзі загаловак) будзе пастаўлена перад апошнім словам. І школа ў Востраве, які так прыгожа апеў у сваёй лірыцы беларускі паэт Рудкоўскі, застанецца.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАВІНЫ · ПАДЗЕІ · ФАКТЫ

## БЕЛАРУСКІЯ «КАРАНІ» Ў ЗАМЕЖЖЫ

**Расіяне з задавальненнем набываюць саджанцы дрэў, якія вырошчваюцца ў беларускіх гадавальніках. Летась дзякуючы пастаўкам пасадачнага матэрыялу за мяжу было атрымана каля 7 мільярдаў рублёў.**

— Сёння ў нашай краіне маецца 1,79 тысячы гектараў лесанасенных плантацый. Матэрыял для пасадкі паходзіць якраз з такіх месцаў. Гэтыя насаджэнні валодаюць палепшанымі спадчыннымі якасцямі, — паведаміў журналістам падчас прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры першы намеснік міністра лясной гаспадаркі Фёдар Лісіца. — Зараз у гадавальніках вырошчваецца каля 300 мільёнаў сеянцаў і саджанцаў. З іх прыкладна 37 мільёнаў плануем прадаць расіянам. Яны ахвотна набываюць, бо матэрыял якасны.

На працягу 2013—2014 года Міністэрства лясной гаспадаркі збіраецца мадэрнізаваць лесанасенны цэнтр. На гэта затрацяць прыкладна 9 мільярдаў рублёў. У планах — вырошчваць пасадачны матэрыял з закрытай каранёвай сістэмай (у кантэйнерах ці з упакаваным земляным комам), бо гэта павялічвае якасць саджанцаў, скарачае затраты на догляд і дае магчымасць вырошчваць самыя «капрызныя» лясныя культуры.

У гэтую суботу пачынаецца традыцыйная акцыя «Тыдзень лесу», падчас якой добраахвотнікі займаюцца пасадкай дрэў. Надвор'е ўнесла ў тэрміны свае карэктывы, таму акцыя не будзе абмяжоўвацца адным тыднем. Мерапрыемствы можна правесці ў любыя дні ажно да пачатку мая. Сёлета плануецца, што новыя дрэвы з'явяцца на тэрыторыі ў 5 тысяч гектараў. Асноўныя культуры, якія будуць пасаджаны, — сасна і елка. Высаджваюць таксама таполю і асіну, але ў меншай колькасці. Ужо вызначана каля тысячы месцаў, дзе будуць пасаджаны дрэвы, створаны памятныя насаджэнні ці закладзены дэндрарыі.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

## І КАМУ ЯНО ТРЭБА, ТАКОЕ КАХАННЕ?

Чаго не зробіш дзеля кахання? Так разважала адчайная 43-гадовая ўкраінка і пайшла праз мяжу ляснымі сцяжынамі. Яна не магла скарыстацца афіцыйным пераходам, бо была ўжо дэпартаваная з Беларусі за незаконнае перасячэнне мяжы. А раней хадзіла лесам, каб было бліжэй і хутчэй. І на гэты раз, рызыкуючы воляй, жыхарка Валыні перайшла мяжу, прыехала ў Жабінку да кавалера. А ён, бурна адсвяткаваўшы сустрэчу... палез біцца. Давялося выклікаць міліцыю. Няцяжка здагадацца, што пасля гэтага жанчыну чакалі прававыя наступствы незаконнага перасячэння мяжы.

**Яна СВЕТАВА.**

## З ТАКІМ НАХАБСТВАМ — ДЫ ПАД НОВЫ РОЖАН

**Работнікі Салігорскай міжрайінспекцыі разам з рэйдавай групай упраўлення аператыўнага рэагавання Дзяржінспекцыі на рацэ Марач паблізу вёскі Новы Рожан Салігорскага раёна затрымалі трох жыхароў Слуцка, якія займаліся незаконнай здабычай рыбы.**

— Пры дапамозе трох сетак браканьеры здабылі 387 асобін розных відаў рыбы агульнай вагой 137,5 кілаграма. Шкода ад іх незаконнай дзейнасці склала 96,3 мільёна рублёў, — расказала «Звяздзе» прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Беларусі Вольга Грамовіч. Гэта можа здацца неверагодным, але літаральна праз тры дні гэтыя ж грамадзяне былі затрыманы на той жа рацэ зноў з сеткамі і незаконным уловам! Спрабуючы ўцячы, яны не падпарадкаваліся дзяржінспектарам. Агулам шкода, нанесеная браканьерамі навакольнаму асяроддзю, склала ўжо 1 275 базавых велічынь, або 125,5 мільёна рублёў! Гэтыя ж грамадзяне падазраюцца таксама ў незаконным гандлі рыбай на тэрыторыі Слуцка і Слуцкага раёна. Вырашаецца пытанне крымінальнай адказнасці браканьераў за незаконную здабычу рыбы, якая пацягнула нанясенне шкоды ў асабліва буйным памеры.

## АГОНЬ НЕ ДАРУЕ І НЕАСЦЯРОЖНАСЦЬ, І ВЫПАДКОВАСЦЬ

**З-за пакінутай на пліце без нагляду ежы ў Верхнядзвінску ледзьве не загінула жанчына.**

— 66-гадовую пенсіянерку, якая пражывае адна, з задымленай зоны кватэры вынеслі выратавальнікі. Яна знаходзілася на падлозе пакоя ў нецвярозым стане. З дыягназам «атручэнне прадуктамі гарэння» пацярпелая была дастаўлена ў мясцовую бальніцу. З ніжэй і вышэй размешчаных паверхаў дома былі эвакуяваны 28 чалавек, — паведаміла «Звяздзе» старшы інспектар цэнтра прапаганды МНС Наталля Скрабец. — Прычынай пажару стала пакінутая без нагляду на ўключанай газавай пліце каструля. У гэты ж дзень здарылася бяда ў вёсцы Жырмуны Воранаўскага раёна: загарэўся 22-гадовы мясцовы жыхар, які разліў на сябе бензін. Высветлілася, што падчас курэння ён выпадкова перакуліў на сябе ёмістасць з палівам, якое імгненна ўспыхнула... Вясковец атрымаў тэрмічныя апёкі першай-трэцяй ступені 80 працэнтаў цела. У бальніцу яго даставіла жонка. Пацярпелы знаходзіцца ў рэанімацыі, стан яго цяжкі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## «ПАДЗАПРАВІЎСЯ» ...

**На аўтазаправачнай станцыі ў Гродне быў затрыманы кіроўца, які «падзаправіўся» да 2,94 праміле, што амаль у дзесяць разоў перавышае дапушчальную норму.**

Супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі звярнулі ўвагу на няўпэўненыя дзеянні кіроўцы легкавога аўтамабіля, які ад'язджаў ад АЗС па вуліцы Славінскага. Перад гэтым 25-гадовы жыхар абласнога цэнтра распіваў спіртное ў кавярні, што знаходзіцца пры аўтазапраўцы. У акно ўбачыў, што трактар прыбірае снег, і вырашыў адагнаць машыну. Тут і трапіў на вочы даішнікам. Дарэчы, у 16-гадовым узросце ён ужо затрымліваўся за ваджэнне ў нецвярозым выглядзе.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

■ Асабістае

# ХАЙ ПОМНІЦЦА ІМЯ ТВАЁ, ТАТА

**Майго бацькі Івана Іванавіча з сялянскага роду Бутэвічаў няма на гэтай некалі такой любай яму зямлі ўжо 12 гадоў. Мамы Марыі Канстанцінаўны, таксама з сялянскага роду Мазаноў, не стала ў 2005-м. Менавіта тады я балюча-востра адчуў, што гэта ж я станаўлюся дарослым, а, значыць, адказным за наш род. Бо пакуль тата з мамай называлі мяне «сынок», я ўсё яшчэ быў дзіцем. Цяпер жа да мяне пераходзіла іх, прызнаюся, няпростая ношка.**

З той пары гэтае разуменне ўсё мацнее, становіцца вастрэйшым. Прыходзіць адчуванне: чым больш часу сплывае ў нябыт, чым больш доўжыцца наша расстанне, тым больш жывымі і дарагімі становяцца ўспаміны, згадкі, карцінкі нашага колішняга сумеснага жыцця. Часам выплывуць міжволі, нечакана, але так захопяць, так возьмуць у палон, што тоненькая нітка даўнейшага звіваецца ў тоўсты клубок шчымлівых напамінкаў, якія сапраўды з часам набываюць ледзь не магічны змест. Ці мо таму, што цяпер для мяне зусім іншы сэнс маюць колішнія словы Хрысціны Лялько: «Раней кожны пражыты дзень набліжаў нашае расстанне. Цяпер кожны пражыты дзень набліжае нашу сустрэчу. Такую формулу вывела я для сябе, каб выжыць тут без цябе, мама».

І бацькавы ўрокі сёння згадваюцца зусім з іншай падсветкай, з іншым асэнсаваннем і напаўненнем. Прыходзіць разуменне таго, што кожнае пакаленне людзей акурат тым і моцнае, што прадаўжае, прымнажае і падмацоўвае ўсё тое карыснае і значнае, што было зроблена папярэднікамі. Інакш парваліся б ніці роду, спынілася б повязь радавая, нацыянальная — бацькоўская повязь.

Не, мой бацька не быў настаўнікам. Быў ён дбайным Хлебаробам і шчырым Хлебасеем. Я знарок напісаў гэтыя словы з вялікіх літар, бо ў іх сэнс жыцця не толькі майго бацькі. Так жылі, такой мерай адказнасці мералі сутнасць і сэнс свайго жыцця і жыцця іншых многія і многія мае землякі. Бацька да канца дзён сваіх не здрадзіў ні гэтай меры, ні маці-зямельцы. Гэта было сапраўды яго, бацькава, поле. Поле жыцця. І нават калі ўжо сілы сталі не тыя, ён не мог кінуць зямлю на волю лёсу. Не здолеў рабіць ёй балюча. Столькі праліўшы на ёй поту, столькі разоў перабраўшы, перамацаўшы сваімі рукамі, сваімі пакрыўленымі ад працы пальцамі кожную яе грудку, не мог дапусціць, каб пуставала яна, каб зарастала пустазеллем. Яго сумленне не магло быць спакойным, калі адчуваў, што зямля, зямелька, зямліца, якой ён кланяўся ўсё сваё свядомае жыццё, можа стаць пусткай. Не вытрымала б такога ягонае сэрца. «Гэта ж ад людзей будзе брыдка, мой ты Толічак», — казалі мне бацькі, тым самым змушаючы дапамагаць ім то садзіць тую бульбу, то капаць, то даставаць неспажытую з пограба і аддаваць тым, каму яна была яшчэ патрэбна.

Вось адзін з тых памятных урокаў: ад людзей брыдка...

Не шкодзь сваёй зямельцы, і яна аддзячыць табе не толькі ўраджаем. Ушануе і людскім прызнаннем, і павагай. А яно ў бацькі было з маленства. З юнацкіх гадоў менавіта яго, а не іншых дарослых, наймалі заможныя землеўласнікі апрацоўваць зямлю. Бо да верасня 1939 года (беларусам вядома гэтая дата — уз'яднанне ў адной дзяржаве) бацька араў чужыя палеткі — сваіх ні ў яго, ні ў яго бацькі амаль што не было, як нелставала грошай, каб «купіць зямлі, прыдбаць свой кут, каб з панскіх выпутацца пут». Пазней тое самае рабіў бацька і ў калгасе «17 верасня», што ў Нясвіжскім раёне. За шчырасць, сапраўдную гаспадарлівасць, зрэшты, за прывязанасць да зямелькі ўганаравалі яго званнем заслужанага калгасніка — усё, што заслужыў. Да апошніх сваіх дзён пры добрым гуморы хваліўся гэтым, як і адзінай сваёй узнагародай — значком «Выдатнік сельскай гаспадаркі БССР». Упісалі бацькава імя ў ганаровую кнігу, якую ён чытаў з цяжкасцю, бо з маленства замест школьнай вучобы спасцігаў найвышэйшую навуку працы на зямлі. Вучыўся чытаць яе засеяныя старонкі і пісаць на іх плугам, сявенькай ды бараной. Тут ён быў сапраўдным акадэмікам, хоць і без адпаведнага дыплома.

> **Не шкодзь сваёй зямельцы, і яна аддзячыць табе не толькі ўраджаем. Ушануе і людскім прызнаннем, і павагай.**

І яшчэ адзін урок у сувязі з гэтым. Калі я хадзіў у далёкую ад хутара Язавец Вялікаліпаўскую васьмігодку, не заўсёды паддаваліся хатнія заданні. Як ні ламаў галаву, не сходзіўся адказ у задачы па арыфметыцы. І тады гучала бацькава парада: «А ты не спяшайся, сынок. Папробуй так, папробуй гэдак...» «Пробаваў!» — агрызаўся я. «А ты яшчэ раз папробуй», — раіла мама. А што іншае мог я зрабіць? Спрабаваў раз за разам. У бальшыні выпадкаў задачка рашалася. А гэтай парадай я вельмі часта карыстаўся і ў значна больш складаных жыццёвых сітуацыях.

Бацькі неназойліва даводзілі нам з сястрой Ленай, якая пасля настаўнічання пенсіянерыць у Докшыцах, простую ісціну: рабі людзям тое, што хочаш, каб яны рабілі табе. Даводзілі не словамі, а сваімі справамі, сваім стаўленнем да хутаран і аднавяскоўцаў, да знаёмых і незнаёмых. Вучылі сваім прыкладам, хоць пра тое, што гэта прыклад, напэўна ж, не думалі. Гэта быў звыклы, звычайны, натуральны лад жыцця. На шчасце такіх урокаў было шмат. Шкадую толькі, што не ўсе яны ўпалі ў вока, дайшлі да вушэй, запалі ў памяці, дацерабіліся да галавы. Гэта сёння я называю іх урокамі.

Некалі ж было проста жыццё. Простае сямейнае жыццё — у асяроддзі і ў згодзе ды ладзе з натуральнымі сялянскімі, царкоўнымі, побытавымі традыцыямі і звычкамі спачатку на хутары Язавец, затым у вёсцы Баяры, што ў тым жа Нясвіжскім раёне.

Помніцца і яшчэ адзін мудры бацькаў урок. З ваеннага часу.

Перад самым вызваленнем «ад немцаў» (так казалі мае аднавяскоўцы) бацька ажаніўся. Каб не зачапіў яго і маю будучую маму нямецкі хапун, бо казалі, што немцы не вывозілі ў Германію жанатых. Вяселле адзначалі на тым самым хутары Язавец, дзе пазней нарадзіўся і я. Спачатку частаваліся ў хаце маладой, затым у маладога. Недакончылі, недагулялі. Недаелі, недаспявалі. Бо не паспелі падзяліць каравай, як у хату прыйшлі паліцэйскія. Са зброяй. Узялі беднага Івана пад ручкі і пад нязмоўчна-здзіўлены плач маладой, радні і гасцей некуды павялі. Забралі за сувязь з партызанамі. Бо ў бацькавага бацькі сапраўды часта начавалі народныя мсціўцы, калі ішлі на блізкую чыгунку Мінск — Брэст. Дапамагалі ім Бутэвічы харчам, нечым іншым. Але не самі немцы высачылі. «Удаў», як аказалася, бацькаў знаёмы з суседняй вёскі. Некалі, падчас калядавання, вяскоўцы хацелі адабраць у хутарскіх накалядаваныя імі каўбасы. Бацька заступіўся. Помстай за гэта і стаў той «вясельны арышт».

Невядома, чым бы ўсё скончылася, калі б не імклівае наступленне савецкіх войскаў. Натуральна, бацька ведаў прозвішча таго, хто «заклаў» яго. Ведаць то ведаў, але ніколі, ні разу не згадаў яго, не назваў нам — ні малым, ні дарослым. Не хацеў множыць людскую варожасць. Бо як бы я ставіўся да хлапчука ці дзяўчынкі, якія былі дзецьмі таго вясковага дзядзькі і з якімі я пазней, магчыма, хадзіў у адну школу, гуляў у адны гульні? Як бы пазіраў на іх пасля гэтага, як успрымаў бы пазней, стаўшы дарослым, іх саміх і іхніх дзяцей — унукаў таго вяскоўца?

Так, бацькавы ўрокі жывуць, трымаюць мяне на гэтай гаротнай і святой для яго зямлі. Дык хай жа ў гэты знакавы дзень даляціць да яго, да мамы слоўка шчырай удзячнасці ім — за маё жыццё, за навуку быць неабыякавым чалавекам на сваёй зямлі. Хай пачуе неба маю просьбу аб дараванні — і за забытыя ўрокі, за недаслуханыя, непачутыя, неперанятыя, няспраўджаныя, за прычыненыя крыўды і маю непаслухмянасць.

Даруй мне, Тата...

Хай помніцца імя тваё. І мне, і дзецям маім, і ўнукам, якіх ты не бачыў і яны не чулі цябе. Але я пастараюся, каб урокі твае запомніліся. Не забыліся. Не выветрыліся.

**Анатоль БУТЭВІЧ,**

*Мінск*


**Информация о выплате дивидендов**

Открытое акционерное общество «Минсктелекомстрой» извещает своих акционеров о том, что в соответствии с решением общего собрания акционеров (протокол № 17 от 29 марта 2013 года) утверждены дивиденды за II полугодие 2012 года в размере 3 173 рубля на одну акцию, которые будут выплачены согласно ведомости, выданной реестродержателем с 26 апреля 2013 года по 24 июня 2013 года. Перечисление будет осуществляться в безналичном порядке на банковские счета, открытые в отделениях и филиалах ОАО «АСБ Беларусбанк».

Справки по телефону (017) 245 83 12.

УНП 100068131

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о снятии объекта с торгов**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению Общества с ограниченной ответственностью «КУБОК» (продавец), сообщает о снятии с торгов объектов недвижимого имущества в составе: **завода по производству блоков из ячеистого бетона в составе зданий: здание главного производственного корпуса (инв. № 714/С-18350, общей площадью 3401,0 кв.м), административно-хозяйственное здание (инв. № 714/С-18351, общей площадью 852,0 кв.м), здание весовой (инв. № 714/С-18349, общей площадью 26,0 кв.м), здание контрольно-пропускного пункта (инв. № 714/С-18348, общей площадью 10,0 кв.м); сооружений: склад цемента (инв. № 714/С-18537, общей площадью 71,1 кв.м.), пропарочные камеры (инв. № 714/С-18188, общей площадью 220,0 кв.м), открытый склад (инв. № 714/С-18190, общей площадью 679,8 кв.м), внутризаводские площадки, дороги (инв. № 714/С-18187, общей площадью 4900,7 кв.м), ограждение (инв. № 714/С-18186, общей площадью протяженность 363,44 м.п., высота 2,05 м.), кабельные линии (инв. № 714/С-18181, электрические сети, протяженность 94,11 м), внутриплощадочные водопроводные сети (инв. № 714/С-18184, протяженность 382,69 м), наружное освещение (инв. № 714/С-18182, ж/б опоры РКУ-250, 7 элементов, протяженность 242,5 м), внутриплощадочные электрические сети (инв. № 714/С-18183, ж/б опора, протяженность 242,5 м), внутриплощадочные тепловые сети (инв. № 714/С-18189, протяженность 397,05 м), внутриплощадочные канализационные сети (инв. № 714/С-18185, вид: канализация для сброса технической и питьевой воды, протяженность 385,60 м), а также оборудования (далее – Объект)**, расположенного на земельных участках, площадью **1,9529 га и 0,0516 га** по адресу: Могилевская область, Осиповичский район, г. Осиповичи, ул. Проектируемая, 8.

Ранее назначенный аукцион должен был состояться **24.04.2013** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

**Тел: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**

**О Т Ч Е Т**
**Местного благотворительного Фонда «Сила добра» об использовании своего имущества за 2012 год.**

Местный благотворительный Фонд «Сила добра» информирует о продолжении своей деятельности согласно Уставу по адресу: г. Могилев, Загородное шоссе, 43-5, а также сообщает о том, что по состоянию на 1 января 2013 года баланс фонда составил 3 500 000 рублей.

В том числе:

стоимость имущества Фонда составляет — 3 500 000 рублей, сформировано за счет взносов учредителей Фонда при его учреждении.

В 2012 году деятельность фонда, направленная на достижение уставных целей, велась на добровольных началах.

Проводилась подготовительная работа для вовлечения широкого круга физических и юридических лиц в благотворительную деятельность, а также велась разъяснительная работа среди населения для организации сбора пожертвований.

Фонд не является учредителем унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах, созданных для осуществления предпринимательской деятельности. *УНП 790770920*

## Открытое акционерное общество «Реммех»

| | |
|---|---|
| Учетный номер плательщика: | 100016829 |
| Вид экономической деятельности: | Производство строительных металлоконструкций |
| Организационно-правовая форма: | |
| Орган управления: | Минстройархитектуры |
| Единицы измерения: | млн. руб. |
| Адрес: | 220024, г. Минск, п/у Колядичи, ул. Бабушкина, 48 |

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 31 декабря 2012 года

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2012 года | На 31 декабря 2011 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **1 Долгосрочные активы** | | | |
| Основные средства: | | | |
| первоначальная стоимость | 101 | 25507 | 22230 |
| амортизация | 102 | 12272 | 10724 |
| остаточная стоимость | 110 | 13235 | 11506 |
| из нее остаточная стоимость ОС, переданных ОАО по договору безвозмездного пользования | 110а | 41 | 44 |
| Нематериальные активы: | | | |
| первоначальная стоимость | 111 | 7 | 7 |
| амортизация | 112 | 7 | 7 |
| остаточная стоимость | 120 | – | – |
| Доходные вложения в материальные активы | | | |
| первоначальная стоимость | 121 | – | – |
| амортизация | 122 | – | – |
| остаточная стоимость | 130 | – | – |
| в том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | – | – |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | – | – |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | – | – |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | – | 9 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 2 | 2 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | – | – |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | – | 969 |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | – | – |
| **Итого по разделу 1** | **190** | **13237** | **12486** |
| **2 Краткосрочные активы** | | | |
| Запасы | 210 | 3791 | 4818 |
| в том числе: материалы | 211 | 2337 | 839 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | – | – |
| незавершенное производство | 213 | – | – |
| готовая продукция и товары | 214 | 1454 | 985 |
| товары отгруженные | 215 | – | 2994 |
| прочие запасы | 216 | – | – |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | – | – |
| Расходы будущих периодов | 230 | – | 327 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 29 | 61 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 3151 | 262 |
| по налогам и сборам в бюджет | 251 | – | – |
| из нее инновационного фонда Минстройархитектуры | 251а | – | – |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | – | – |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 171 | 45 |
| в т.ч. денежные средства на депозитных счетах | 271 | – | – |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 41 | 41 |
| в том числе недостачи и потери | 281 | 41 | 41 |
| **Итого по разделу 2** | **290** | **7183** | **5554** |
| **Баланс** | **300** | **20420** | **18040** |
| **Собственный капитал и обязательства** | **Код строки** | **На 31 декабря 2012 года** | **На 31 декабря 2011 года** |
| **3 Собственный капитал** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 938 | 938 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | – | – |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | – | – |
| Резервный капитал | 440 | 61 | 61 |
| Добавочный капитал | 450 | 12408 | 11764 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 468 | 41 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | – | – |
| Целевое финансирование | 480 | – | – |
| **Итого по разделу 3** | **490** | **13875** | **12804** |
| **4 Долгосрочные обязательства** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | – | – |
| в т.ч. инновационного фонда Минстройархитектуры | 511 | – | – |
| Прочие долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | – | – |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | – | – |
| Доходы будущих периодов | 540 | – | – |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | – | – |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | – | – |
| **Итого по разделу 4** | **590** | **–** | **–** |
| **5 Краткосрочные обязательства** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 4246 | 1980 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | – | – |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 2299 | 3256 |
| в том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 716 | 1451 |
| по авансам полученным | 632 | – | 1292 |
| по налогам и сборам | 633 | 1223 | 190 |
| из нее инновационному фонду Минстройархитектуры | 633а | 583 | 107 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 191 | 4 |
| по оплате труда | 635 | 169 | 260 |
| по лизинговым платежам | 636 | – | – |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | – | – |
| в том числе: | | | |
| в бюджет | 637а | – | – |
| авансовые поступления в счет вкладов в уставный капитал | 637б | – | – |
| прочим кредиторам | 638 | – | 59 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | – | – |
| Доходы будущих периодов | 650 | – | – |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | – | – |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | – | – |
| **Итого по разделу 5** | **690** | **6545** | **5236** |
| **Баланс** | **700** | **20420** | **18040** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь - декабрь 2012 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь - декабрь 2012 года | За январь - декабрь 2011 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 29765 | 10371 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | 23955 | 6879 |
| Валовая прибыль (010 - 020) | 030 | 5810 | 3492 |
| Управленческие расходы | 040 | (5146) | (3365) |
| Расходы на реализацию | 050 | ( – ) | ( – ) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050) | 060 | 664 | 127 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 245 | 668 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (110) | (550) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080) | 090 | 799 | 245 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 11 | 1 |
| в том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | – | – |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | – | – |
| проценты к получению | 103 | 11 | 1 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | – | – |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | ( – ) | ( – ) |
| в том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | – | – |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | – | – |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | – | – |
| в том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | – | – |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | – | – |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (250) | (188) |
| в том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | 250 | 188 |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | – | – |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | – | – |
| Иные доходы и расходы | 140 | – | – |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 – 110 + 120 – 130 ± 140) | 150 | (239) | (187) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 150) | 160 | 560 | 58 |
| Налог на прибыль | 170 | (92) | (17) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 180 | – | – |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 190 | – | – |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | ( – ) | ( – ) |
| Чистая прибыль (убыток) (± 160 – 170 ± 180 ± 190 – 200) | 210 | 468 | 41 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | 1908 | 1583 |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | – | – |
| Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230) | 240 | 2376 | 1624 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию, рублей | 250 | 75 | 7 |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию, рублей | 260 | 31 | 5 |

**Руководитель** **В.В. Янушкевич**
**Главный бухгалтер** **В.П. Герман**
Дата составления: 03.04.2013 г.

**ЗАВЕРЕНО**
Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов Республики Беларусь
_____________ С.А.Сушко
«05» апреля 2013 г.

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ВОСЕМНАДЦАТОГО ВЫПУСКА ООО «ЮНИВЕСТ-М»

**1. Полное и сокращенное наименование эмитента (на белорусском и русском языках)**

на белорусском языке:
полное: Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ЮНІВЕСТ-М»;
сокращенное: ТАА «ЮНІВЕСТ-М»;
на русском языке:
полное: Общество с ограниченной ответственностью «ЮНИВЕСТ-М»;
сокращенное: ООО «ЮНИВЕСТ-М».

**2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)**

Республика Беларусь, 220005, г. Минск, ул. Гикало, 3, телефон: (017) 2845954, телефон/факс: (017) 2845964, e-mail: univest_minsk@mail.ru.

**3. Основные виды деятельности эмитента**

Основной целью деятельности Эмитента является извлечение прибыли с последующим ее распределением между участниками.

В соответствии с Уставом Эмитент вправе в порядке, предусмотренном законодательством Республики Беларусь, осуществлять любые виды экономической деятельности, не противоречащие законодательству.

Отдельными видами деятельности, перечень которых определяется законодательными актами, Эмитент может заниматься только на основании специального разрешения (лицензии).

Эмитент осуществляет внешнеэкономическую деятельность в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

**4. Номера расчетного счета Эмитента, на который будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи жилищных Облигаций 18-го выпуска Эмитента (далее по тексту – Облигации), наименование обслуживающего банка**

Денежные средства при проведении открытой продажи Облигаций будут поступать на счет Эмитента:

№ 3012407350019 (BYR), 3012407355014 (USD) в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) (адрес банка: г. Минск, Московская, 14), код 108;

№ 3012012370018 (BYR), 3012012370021 (USD) в ОАО «БПС-Сбербанк» (адрес банка: г. Минск, бульвар имени В. Мулявина, д. 6) код 369.

**5. Наименование периодического печатного издания, определенного Эмитентом для раскрытия информации и сроки ее публикации**

Бухгалтерская отчетность по итогам работы Эмитента за 2013 год и последующие годы подлежит публикации не позднее трех месяцев со дня окончания отчетного финансового года в газете «Звязда».

Информация о принятом решении о реорганизации или ликвидации Эмитента подлежит публикации в приложении к журналу «Юстиция Беларуси» не позднее 10 (Десяти) дней с момента принятия соответствующего решения.

Информация о возбуждении в отношении Эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) передается управляющим для опубликования в средствах массовой информации в течение 5 (Пяти) дней с момента получения им соответствующего судебного постановления.

Информация о внесенных изменениях в Проспект эмиссии подлежит публикации в газете «Звязда» не позднее 7 (Семи) дней с момента регистрации соответствующих изменений в Проспект эмиссии Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов.

**6. Сведения о депозитарии, обслуживающем Эмитента**

**Депозитарием Эмитента является депозитарий** ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)**, код Депозитария – 016** (**зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 07.10.1996 года, регистрационный номер 57***)*, расположенный по адресу: Республика Беларусь, 220007, г. Минск, ул. Московская, 14, действующий на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/5200-1246-1077 от 26.03.1997 года (Срок действия лицензии – до 29.07.2022 года).

**7. Размер уставного фонда Эмитента**

Уставный фонд Эмитента сформирован полностью в размере, предусмотренном Уставом:

20 512,82 (Двадцать тысяч пятьсот двенадцать, 82/100) доллара США.

**8. Дата, номер государственной регистрации Эмитента и наименование органа, его зарегистрировавшего**

Общество с ограниченной ответственностью «ЮНИВЕСТ-М» создано в результате реорганизации Иностранного частного унитарного производственно-торгового предприятия «ЮНИВЕСТ-М» ООО «ЮНИВЕСТ Консалтинг энд Трейдинг ГмбХ» (ИП ЮНИВЕСТ-М»), зарегистрированного решением Минского городского исполнительного комитета от 24.03.2004 г. №633 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №800009861, с местом нахождения по адресу: 220005, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Гикало, д. 3, и является преемником прав и обязанностей последнего.

**9. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии Облигаций**

С более подробной информацией и проспектом эмиссии Облигаций можно ознакомиться в течение срока размещения по адресу: ежедневно в рабочие дни (кроме воскресенья) с 09-00 до 19-00 по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 2. Ознакамливающееся лицо имеет право читать и делать выписки из предоставляемых в соответствии с настоящим пунктом документов.

**10. Форма выпуска и вид Облигаций, объем эмиссии, количество, серия, номера:**

| | |
|---|---|
| **Форма выпуска и вид Облигаций** | Жилищные, бездокументарные, именные, неконвертируемые |
| **Объем эмиссии** | 9 000 000 000 (Девять миллиардов) белорусских рублей |
| **Количество Облигаций** | 1 500 (Одна тысяча пятьсот) штук |
| **Серия, номера Облигаций** | ЮН-18, №№ 000001-001500 |

**11. Номинальная стоимость Облигаций**

Номинальная стоимость одной Облигации составляет 6 000 000 (Шесть миллионов) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный 1 (одному) метру квадратному общей площади квартир (далее – жилое помещение) в строящемся жилом доме № 4А, Б (по генплану) в районе жилой застройки в границах ул. Кальварийская – ул.Скрыганова – железная дорога.

Общий эквивалент номинальной стоимости Облигаций составляет 1 500 (Одна тысяча пятьсот) квадратных метров.

Эквивалент номинальной стоимости Облигаций не подлежит изменению в течение срока обращения Облигаций настоящего выпуска.

**12. Период проведения открытой продажи Облигаций**

Датой начала открытой продажи Облигаций является 15 апреля 2013 года.

Датой окончания открытой продажи Облигаций является 30 декабря 2014 года.

